З НАДЫХОДЗЯЧЫМ СВЯТАМ ПРАЦЫ – 1-га МАЯ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№8(1021) | Пятніца, 26 красавіка 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

*РЕКТОРУ ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМ. Ф.СКОРИНЫ СЕЛЬКИНУ М.В.*

*Уважаемый Михаил Васильевич!*

Гомельский областной исполнительный комитет выражает сердечную благодарность Вам и в Вашем лице всем организаторам областной научно-практической конференции "Союз Беларуси и России: реалии и перспективы" за хорошую работу по подготовке и проведению данного мероприятия. Конференция, состоявшаяся на базе ГГУ им. Ф.Скорины 2 апреля с.г. в рамках празднования Дня единения народов Беларуси и России, прошла на высоком организационном и научно-методическом уровне. Также благодаря четкой работе руководителей и сотрудников университета, на высоком уровне был организован прием официальной делегации Брянской области, прибывшей для участия в конференции.

Особо хотелось бы отметить большой вклад в подготовку и успешное проведение данного мероприятия со стороны проректоров университета Лина Д.Г. и Кармазина А.П., руководителей секций Карпей Т.В., Старовойтова М.И., Рычкова А.Е., сотрудников НИС Сафонова В.Г. и Седляровой С.Н. Очень содержательными были доклады преподавателей университета Станкевич А.А. и Эсмантовича И.Ф. на пленарном заседании, а также выступление Павловца Д.Д. на заседании секции.

**Заместитель председателя облисполкома Тиханская Р.А.**

## НАМ ЖЫЦЬ З РАСІЯЙ У САЮЗЕ





Словы, вынесеныя ў загаловак, сталі лейтматыўнымі ў выступленнях кожнага прамоўцы, які 2-га красавіка (аб гэтым паведамлялася ўжо ў нашай газеце) выступіў на абласной навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, што праходзіла ў актавай зале ГДУ. Як мы інфармавалі сваіх чытачоў, на пленарным пасяджэнні канферэнцыі ад нашага універсітэта выступілі загадчык кафедры беларускай мовы прафесар А.А.Станкевіч і дацэнт кафедры гісторыі Беларусі І.Ф.Эсмантовіч.

На секцыйных пасяджэннях былі заслуханы і абмеркаваны даклады дэкана гістарычнага факультэта дацэнта М.І.Старавойтава, загадчыкаў кафедр дацэнтаў Б.У.Сарвірава, С.Р.Шулейкі, А.А.Рубана, В.П.Пічукова, Д.Д.Паўлаўца, дацэнта Л.М.Крывашэевай, асістэнтаў В.І.Галко, А.І.Зелянковай.

З вялікай цікавасцю на канферэнцыі быў выслуханы даклад "Геапалітычнае значэнне інтэграцыйных працэсаў паміж Беларуссю і Расіяй", з якім выступіў **(на здымку)** старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў кандыдат эканамічных навук В.С.Сяліцкі.

**Фота У.Чысціка.**

*З УЗНАГАРОДАЙ!*

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў узнагароджаны доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі **МІЦЮРЫЧ Георгій Сямёнавіч**.

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі **МІЦЮРЫЧ Георгій Сямёнавіч**.

*ВІНШУЕМ!*

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць кандыдата фізіка-матэматычных навук з кафедры радыёфізікі і электронікі **МЫШКАЎЦА Віктара Мікалаевіча** з прысваеннем яму БелВАКам вучонага звання дацэнт.

## РАЗМЕРКАВАННЕ СЯРОД ВЫПУСКНІКОЎ – СПЕЦЫЯЛІСТЫ НОВЫХ ПРАФЕСІЙ

Напрацягу трох дзён у ГДУ імя Ф.Скарыны напружана працавала дзяржаўная камісія па размеркаванню маладых спецыялістаў. Задача заключалася ў тым, каб з улікам колькасці набраных балаў за ўсе гады навучання, сямейнага становішча і іншых акалічнасцей максімальна задаволіць інтарэсы кожнага выпускніка. Сёлета ж пасля здачы дзяржаўных экзаменаў і абароны дыпломных работ у чэрвені атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі вядучай ВНУ Беларускага Палесся 858 яе выхаванцаў. 125 з іх заканчваюць эканамічны факультэт. Сёлета тут адбудуцца першыя выпускі па дзвюх спецыяльнасцях: "Фінансы і крэдыт" і "Камерцыйная дзейнасць".

Адбудзецца першы выпуск і псіхолагаў. Гэтую спецыяльнасць набылі 20 юнакоў і дзяўчат.

Звыш 20 найбольш падрыхтаваных і схільных да выкладчыцкай і навукова-даследчай дзейнасці выпускнікоў універсітэт пакідае на сваіх кафедрах і ў іншых структурных падраздзяленнях. Яны прыйдуць таксама на кафедры ВНУ Гомеля і Мазыра.

Пераважная колькасць выпускнікоў ГДУ пачне сваю працоўную дзейнасць на прадпрыемствах, у арганізацыях, разнастайных фірмах, навукова-даследчых установах, школах і прафтэхвучылішчах Гомельшчыны. Папоўняць маладыя спецыялісты таксама абласныя, гарадскія і раённыя праваахоўныя органы. Некалькі выпускнікоў з дыпломамі ГДУ адправяцца па месцах свайго карэннага жыхарства – у Расію.

Кожны, хто меў на гэта падставы, атрымаў права на самастойнае працаўладкаванне. У цэлым жа сёлетняе размеркаванне выпускнікоў стацыянарнага навучання асаблівых супярэчнасцей і незадавальненняў, як гэта здаралася іншы раз у папярэднія гады, не выклікала.

Сёлета дыпломы ГДУ атрымаюць каля 450 студэнтаў, якія заканчваюць навучанне на завочным факультэце. 12 чалавекам яны ўжо ўручаны. Гэта тым, хто набываў другую вышэйшую адукацыю і стаў юрыстам па скарочанай праграме вучобы за 3 гады і 8 месяцаў.

**Б.ВАЛОДЗІН.**





Дэкан эканамічнага факультэта, загадчык кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю Т.В.Карпей у дакументах аб размеркаванні маладых спецыялістаў робіць запіс аб тым, што сёлетні выпускнік Сяргей Ігнаценка застаецца на працу ў роднай альма-матэр.

У адной са школ Буда-Кашалёўскага раёна пачне сваю педагагічную дзейнасць выпускнік матэматычнага факультэта Юрый Юрчанка.



Выпускніца спецыяльнасці "Псіхалогія" Святлана Швайлікава атрымала накіраванне ў Гомельскае ПТВ-126 народных мастацкіх промыслаў.

Фота У.Чысціка.

ПРАБЛЕМЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

# НАВОШТА СТУДЭНТУ ДЫПЛОМ БАКАЛАЎРА?

Усё больш студэнтаў беларускіх ВНУ (у тым ліку і нашага універсітэта) вырашаюць прадоўжыць сваё навучанне за мяжой. Ёсць і такія, хто атрымаўшы дыплом беларускай ВНУ, спрабуе працаўладкавацца ў іншых краінах.

Якія перспектывы іх там чакаюць? Што робіць дзяржава для таго, каб гэтыя працэсы праходзілі менш хваравіта? Што трэба зрабіць самім студэнтам, каб аблегчыць сваю інтэграванасць у адукацыйныя сістэмы і рынкі працы замежжа?

Перш за ўсё хочацца адзначыць, што канцэптуальнымі дакументамі развіцця вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь вызначаны шэраг задач, якія звязаны з развіццём акадэмічнай мабільнасці студэнтаў і забеспячэннем працаўладкавання выпускнікоў ВНУ на еўрапейскім рынку працы. Першыя практычныя крокі ў вырашэнні гэтых задач ужо зроблены.

Па-першае, 4 студзеня 2002 года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падпісаны Указ "Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Канвенцыі аб прызнанні кваліфікацый, якія адносяцца да вышэйшай адукацыі ў Еўрапейскім рэгіёне" ад 11 красавіка 1997 года. Савет Еўропы сумесна з ЮНЕСКА распрацавалі новую, адзіную для ўсіх еўрапейскіх краін Канвенцыю аб прызнанні дакументаў аб адукацыі. Менавіта 11 красавіка 1997 года яна была адкрыта для падпісання на дыпламатычнай канферэнцыі ў Лісабоне. Галоўная задача Канвенцыі – забяспечыць узаемнае прызнанне дакументаў аб адукацыі, якія выдаюцца ў розных краінах, і тым самым значна пашырыць для краін Еўропы магчымасці вучыцца і працаваць за мяжой. Удзельнікамі згаданай Канвенцыі стала ўжо больш за 50 дзяржаў.

Па-другое, з 1 студзеня 2002 года ў рэспубліцы пачаў дзейнічаць новы класіфікатар спецыяльнасцей і кваліфікацый, які ўвязаны з існуючай еўрапейскай сістэмай спецыяльнасцей і кваліфікацый. Новыя кваліфікацыі будуць прысвойвацца выпускнікам беларускіх ВНУ з 2007 года. У шэрагу выпадкаў гэтыя кваліфікацыі сталі больш прыцягальнымі. Напрыклад, выпускнікам спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" будзе прысвойвацца кваліфікацыя "Інжынер па інфармацыйных тэхналогіях" (цяпер – "Інжынер-сістэматэхнік"). Выпускнікі спецыяльнасці "Замежныя мовы" будуць атрымоўваць кваліфікацыю "Выкладчык замежных моў" (раней было "Настаўнік замежных моў"). Больш шырокай стане кваліфікацыя ў гісторыкаў ("Гісторык. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін") і ў матэматыкаў – ("Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі").

Па-трэцяе, у рамках Нацыянальнага інфармацыйнага аналітычнага цэнтра кіравання якасцю адукацыі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Белдзяржуніверсітэта пачаў дзейнічаць цэнтр па прызнанню дакументаў аб вышэйшай адукацыі (Belarusian ENIC). У функцыі Цэнтра ўваходзіць ажыццяўленне інфармацыйна-аналітычнага і кансультатыўнага забеспячэння Міністэрства адукацыі, іншых міністэрстваў і ведамстваў, ВНУ і прыватных асоб пры вырашэнні пытанняў акадэмічнага прызнання дакументаў аб вышэйшай адукацыі і мабільнасці. Цэнтр праводзіць таксама экспертызы для нострыфікацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежных дыпломаў і сертыфікатаў аб вышэйшай адукацыі, прызнання курсаў і перыядаў навучання. Студэнты, якія праходзяць навучанне за мяжой (Расія, Украіна, заходнееўрапейскія краіны, ЗША і г.д.), у Цэнтры змогуць атрымаць адказы на пытанні аб перспектывах заліку або незаліку пройдзеных курсаў навучання, прызнання або непрызнання сваіх дыпломаў. Дарэчы, іменна ў гэтым Цэнтры нашы студэнты, якія навучаюцца ў Франка-Беларускім інстытуце кіравання, здолеюць атрымаць адказ аб нострыфікацыі французскіх дыпломаў з тым, каб у далейшым на беларускім рынку працы знайсці месца працаўладкавання.

Развіццю акадэмічнай мабільнасці (г.зн. магчымасці доступу для навучання ў іншых краінах) і забеспячэнню працаўладкавання выпускнікоў ВНУ на еўрапейскім рынку заклікана садзейнічаць прыняцце сістэмы вышэйшай адукацыі, заснаванай на двух галоўных цыклах – базавым (бакалаўры) і паслядыпломным (магістры або іншыя параўнальныя ступені). Праходжанне першага ўзроўню забяспечвае базавую падрыхтоўку і падыходзячы ўзровень кваліфікацыі, які адпавядае запытам еўрапейскага рынку працы. Другі ўзровень прадугледжвае спецыялізацыю і ўніверсальнасць падрыхтоўкі і звязаны з прысваеннем акадэмічнай ступені магістра.

Трэба адзначыць, што працэсы, звязаныя з пераходам да шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі (бакалаўр – спецыяліст – магістр), ініцыіраваны і актыўна развіваюцца Белдзяржуніверсітэтам. Іх сістэма ўключае дзве ступені: 1-я ступень – бакалаўр (нарматыўны тэрмін навучання 4 гады), 2-я ступень – спецыяліст (5 гадоў) або магістр (6 гадоў). У такой схеме студэнт вырашае сам: або яму пасля чатырохгадовага тэрміну навучання здаваць дзяржаўны экзамен, атрымаць дыплом бакалаўра і пайсці на "ўласны хлеб", або працягваць навучанне для атрымання дыплома спецыяліста або магістра.

Пры гэтым замежны вопыт (у прыватнасці, Маскоўскага інстытута электронікі і матэматыкі, з якім мы сумесна ажыццяўляем падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці "Нацыянальная эканоміка") сведчыць, што па асобных спецыяльнасцях да 50% выпускнікоў гэтай ВНУ задавальняюцца дыпломам бакалаўра і назад сюды для працягу навучання не вяртаюцца.

Прагназуецца, што ў перспектыве магчыма адмена падрыхтоўкі спецыялістаў у класічных універсітэтах з 5-гадовым тэрмінам навучання, які можа захавацца ў тэхнічных і іншых спецыялізаваных ВНУ.

Мадэль сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў, прапанаваная БДУ, знайшла адабрэнне на лютаўскай нарадзе рэктараў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Да 2008 года ўся сістэма вышэйшай школы павінна стаць дзвюхступеньчатай. На працягу 2-3 гадоў будзе ажыццяўляцца распрацоўка неабходнай прававой і нарматыўна-вучэбнай дакументацыі. Плануецца, што з бягучага года такая мадэль пройдзе апрабацыю і ў нашым універсітэце на матэматычным, фізічным, філалагічным і эканамічным факультэтах, якія маюць добры кадравы патэнцыял (па 5-10 дактароў навук і 25-45 кандыдатаў навук на факультэце), развітыя аспірантуры і агульнапрызнаныя навуковыя школы.

Адзначым, што ў рэспубліцы склалася іншая практыка падрыхтоўкі бакалаўраў. Яна разглядае бакалаўрыят не як узровень адукацыі, а як дадатковую праграму навучання аб'ёмам каля 300 вучэбных гадзін. З 1998 года на эканамічным і філалагічным факультэтах беларускія і замежныя студэнты займаюцца па праграме бакалаўрскай падрыхтоўкі і 74 з іх ужо атрымалі акадэмічную ступень бакалаўра эканамічных і філалагічных навук. Сёлета рыхтуюцца атрымаць дыплом бакалаўра яшчэ 20 беларускіх і замежных студэнтаў.

Праграма бакалаўрскай падрыхтоўкі ажыццяўляецца на 3-5 курсах, уключае такія дысцыпліны, як "Логіка і метадалогія навуковых даследаванняў", "Дзелавая замежная мова", "Псіхалогія дзелавых адносін", "Беларуская мова і літаратура" і спецдысцыпліны. Навучанне заканчваецца дзяржаўным экзаменам.

Не выпадкова цікавасць да праграмы бакалаўрскай падрыхтоўкі асабліва праяўляюць замежныя студэнты. Маючы вялікі вопыт работы з адукацыйнымі сістэмамі іншых краін у параўнанні з нашымі студэнтамі-выпускнікамі, яны ведаюць, што сёння прадстаўляемы ў іншых дзяржавах наш дыплом аб вышэйшай адукацыі часта разглядаецца як дыплом бакалаўра. Калі ж выпускнік прадставіць работадаўцу два дыпломы (бакалаўра і спецыяліста), дык да другога з іх ужо адносяцца як да дыплома магістра, а гэта ў сваю чаргу стварае дадатковыя магчымасці працаўладкавання ў іншай краіне. У гэтай сувязі ўяўляецца разумным для тых студэнтаў, якія навучаюцца па аднаўзроўневай сістэме падрыхтоўкі (а магчыма і для тых, хто ўжо закончыў ВНУ) захаваць хаця б на пераходны перыяд бакалаўрыят, як праграму навучання.

У апошні час ад студэнтаў (як правіла, тых, хто вучыцца на "добра" і "выдатна") паступаюць прапановы аб развіцці ва універсітэце праграм бакалаўрскай падрыхтоўкі. Гэтыя прапановы разгледжаны на рэктарацэ і прынята рашэнне аб разгортванні такіх праграм з пачатку наступнага навучальнага года на ўсіх факультэтах для студэнтаў 3-4 курсаў. На жаль, праграмы бакалаўрскай падрыхтоўкі не ўключаны ў вучэбныя планы спецыяльнасцей. Таму размова можа ісці толькі аб аплаце такіх праграм самімі студэнтамі. Па ацэнках планава-фінансавага аддзела кошт навучання складзе каля 165,2 тыс. руб. за ўвесь тэрмін, або 8,2 тыс. руб. у месяц.

Дэканам факультэтаў даручана вывучыць студэнцкі запыт на праграмы бакалаўрскай падрыхтоўкі (таму што кошт навучання фарміруецца, у прыватнасці, і ад напаўнення груп) і распрацаваць адпаведныя вучэбныя планы.

Мы спадзяемся, што рэалізацыя калектывам універсітэта вызначаных задач будзе садзейнічаць павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і ўзмацненню акадэмічнай мабільнасці нашых выпуснікоў.

**С.КАМОРНІКАЎ,**
**прарэктар па вучэбнай рабоце**
**доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.**

## УНЕСЕНЫ ЗМЯНЕННІ Ў КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

У адпаведнасці з пастановай Савета універсітэта ад 28 сакавіка 2002 г. Калектыўны дагавор дапоўнены:

Пункт 6.7. абзацам:

**Аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам і супрацоўнікам універсітэта, якія дасягнулі 65, 70 і г.д. гадоў (адпрацаваўшы ва універсітэце не менш 5 гадоў), ажыццяўляецца пры наяўнасці фінансавых сродкаў.**

Пункт 6.9. сфармуляваны ў наступнай рэдакцыі:

**Аказанне матэрыяльнай дапамогі на пахаванне пенсіянераў, апошнім месцам працы якіх быў універсітэт, дзе яны адпрацавалі не менш 5 гадоў, праводзіць пры наяўнасці фінансавых сродкаў за кошт фонду матэрыяльнага заахвочвання і сродкаў, што перавышаюць даходы над расходамі па пазабюджэтнай дзейнасці.**

## У ЛІЧБАХ – ЖЫЦЦЁВЫЯ РЭАЛІІ

**(з выступлення старшыні прафкама студэнтаў Н.І.Колтышавай на сакавіцкім Савеце універсітэта)**

"Пагадненне па сацыяльна-эканамічных пытаннях" з'яўляецца дадаткам да Калектыўнага дагавору ГДУ і адлюстроўвае ўсе сферы жыццядзейнасці студэнцкага калектыву: вучэбна-выхаваўчыя і жыллёва-бытавыя пытанні, матэрыяльнае забеспячэнне, культурна-масавую і спартыўна-масавую работу.

Па стану на 1 сакавіка бягучага года ва універсітэце на стацыянары налічвалася 5406 студэнтаў, у тым ліку: на бюджэце – 4754, на платнай форме навучання – 652 чалавекі. Сярод студэнтаў 678 мелі ўзрост да 18 гадоў. 29 студэнтаў з'яўляюцца сіратамі, 24 – інвалідамі, 19 – маюць ільготы па арт. 18 Закона "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС", 42 – па арт.-арт. 22, 23, 24 гэтага ж Закона. 147 студэнтаў – сямейныя, 128 з іх маюць дзяцей. 9 студэнтак – маці-адзіночкі.

4278 студэнтаў універсітэта атрымоўваюць стыпендыю. Чацвёртакурснік эканамічнага факультэта Сяргей Каморнікаў і пяцікурсніца факультэта замежных моў Таццяна Сеніна атрымоўваюць стыпендыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 9 студэнтаў удастоены імянных стыпендый, 45 – Савета універсітэта, 5 – прафсаюзных (даплачваецца 1 мінімальная зарплата). 830 студэнтам назначана сацыяльная стыпендыя. На другое паўгоддзе бягучага навучальнага года яе афармілі 9 чалавек.

Затрымак па выплаце стыпендыі студэнтам, якія навучаюцца па бюджэту, не было, аднак здараліся і ёсць затрымкі па выплаце 50 % надбаўкі па арт. 30 згодна Закона "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС".

На матэрыяльную дапамогу выдзяляецца 1,5 % ад стыпендыяльнага фонду. Распрацавана Палажэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі, у якім прадугледжана яе дыферэнцыраванне. Загады на аказанне матэрыяльнай дапамогі ў абавязковым парадку ўзгадняюцца са студэнцкай прафсаюзнай арганізацыяй. За мінулы год яе агульная сума склала 11 млн. 707 тыс. 700 руб. З бюджэту прафкама аказана дапамог на 1.870.000 руб. або крыху менш 1/6 яго наяўнасці.

Летась мы ўнеслі дапаўненне ў Калектыўны дагавор, і студэнтам, якія вучацца на платнай аснове, можа быць аказана матэрыяльная дапамога за кошт перавышэння даходу над расходамі. 9 чалавек атрымалі такую дапамогу.

Ва універсітэце – 4 інтэрнаты на 1536 месц. Аднак 200 студэнтаў яшчэ маюць у ім патрэбу. 123 месцы давялося арэндаваць у чыгуначным тэхнікуме, за што даплачваецца 1,5 млн. руб. у месяц.

Нельга не выказаць удзячнасць рэктарату за праведзены рамонт у інтэрнаце № 4. Адначасова ёсць просьба даўкамплектаваць пакоі адпачынку ў інтэрнатах (няма тафцінга, мэблі).

У інтэрнатах працуюць выхавацелі, культарганізатары. Больш стала парадку, чысціні. 48,7% студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, удзельнічаюць у рабоце аматарскіх аб'яднанняў, калектывах самадзейнасці.

Асноўнымі арганізатарамі карыснага правядзення вольнага часу студэнтаў з'яўляюцца маладзёжны комплекс і спартыўны клуб універсітэта. За мінулы год імі было праведзена 308 мерапрыемстваў, з іх 190 – на платнай аснове, якія наведала 58420 чалавек. На арганізацыю і правядзенне культмасавых мерапрыемстваў прафкамам выдзелена 3.930.000. руб. – 54% бюджэту (пакупка сувеніраў, кветак, аплата 50 % кошту білетаў у тэатр).

Ва універсітэце праводзіцца спартакіяда па 14 відах спорту. Прафкамам студэнтаў на ўзнагароджванне яе пераможцаў выдзелена 460 тыс. руб.

За мінулы навучальны год у прафкам звярнулася з рознымі просьбамі, а таксама па пытаннях набыцця пуцёвак на аздараўленне 3600 студэнтаў. Намі выдадзена 1164 пуцёўкі ва універсітэцкі санаторый-прафілакторый, 89 пуцёвак – у розныя санаторыі, 133 – у дамы адпачынку і на турбазы.

Нельга не выказаць словы ўдзячнасці дэканам факультэтаў. Актыў студэнтаў заўсёды знаходзіць у іх разуменне і падтрымку.

## ВІНШУЕМ!

Калектыў кафедры алгебры і геаметрыі горача віншуе выпускніцу яе аспірантуры **ГРЫБОЎСКУЮ Яўгенію Яўгенаўну** (навуковы кіраўнік – прафесар В.С.Манахаў) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

КАНФЕРЭНЦЫІ

## ПА ПРАБЛЕМАХ ЭКАНОМІКІ

На базе Бабруйскага філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта прайшла навукова-практычная канферэнцыя "Сацыяльна-эканамічнае развіццё і праблемы стабілізацыі эканомікі Рэспублікі Беларусь".

На пленарным пасяджэнні і 5 секцыях былі заслуханы і абмеркаваны каля 360 дакладаў па розных праблемах эканомікі: эканамічнай палітыцы і праблемах макраэканамічнай раўнавагі, павышэння эфектыўнасці дзейнасці прадпрыемстваў, сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў на прадпрыемствах, камп'ютэрных тэхналогій і матэматычных метадаў павышэння эфектыўнасці дзейнасці прадпрыемстваў, фінансаў і бухгалтарскага ўліку.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі практычна ўсіх рэгіёнаў рэспублікі, а таксама госці з Польшчы. Наш універсітэт быў прадстаўлены 10 дакладамі.

# НЕ СЦІХАЕ НАШ БОЛЬ

**16 гадоў таму назад 26 красавіка адбылася самая буйная антрапагенная трагедыя XX стагоддзя – катастрофа на Чарнобыльскай АЭС. Яе чорныя сляды і сёння наносяць непапраўную шкоду здароўю мільёнам людзей трох суседніх славянскіх рэспублік, выклікаюць трывогу за лёс будучых пакаленняў.**

**Увазе сваіх чытачоў мы прапануем верш студэнта фізічнага факультэта, які прысвечаны гэтай страшэннай падзеі.**

Станислав ГАЛКОВСКИЙ

* * *

Чернобыль. Плачет Беларусь.
Душа искривлена от боли.
И я с сомнением молюсь,
Раз в мире всё по божьей воле.

Сердец разбиты зеркала,
Мне трудно жить, любить и верить.
Жгут сострадания слова,
Словами горе не измерить.

О, неба синяя печаль,
Здесь смерть живет в одежде детской.
Крестами вымощена даль –
След энергетики советской.

Но вьет гнездо наивный птах,
Не зная ужас радиаций.
И чей-то не "стандартный" прах –
Итог не признанных мутаций.

Мы все – один эксперимент,
Под лупой мира запотевшей.
Но Скорбь взошла на постамент,
Орущей и окаменевшей.

Страна как операционный шов
От раковых, смертельных клеток.
Моя строка – могильный ров,
Мой гимн – плач нерожденных деток.

Мы кем-то приговорены,
Рыдайте, матери и жены.
Кто по вине, кто без вины,
Уйдут в этапы миллионы.

Чернобыль. Плачет Беларусь.
Душа исчернена от боли.
И я с сомнением молюсь,
Раз в мире все по божьей воле.

НА МІЖНАРОДНАЙ ВЫСТАВЕ

# ВЫХАД НА СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ

У нямецкім горадзе Гановеры ў чарговы раз прайшла буйнейшая ў свеце міжнародная выстава СеВІТ, прысвечаная апошнім дасягненням у галіне інфармацыйных тэхналогій. На велізарнай плошчы Messe размясцілася звыш 30 павільёнаў. Тэматыка стэндаў кожнага з іх адпавядала аднаму з асноўных напрамкаў выставы. Для таго, каб наведвальнікі не трацілі шмат часу ў хадзьбе паміж павільёнамі па тэрыторыі выставы, з якой азнаёмілася звыш 700 тыс. чалавек, быў арганізаваны рух аўтобусаў.

Сёлета, пасля працяглага перапынку, на СеВІТ з'явіўся агульны стэнд ВНУ і навуковых арганізацый Беларусі. Сярод іх: Нацыянальнай акадэміі навук, БДУ, БДПА, БДУІР, Цэнтра інфармацыйных тэхналогій. Упершыню ў камп'ютэрнай выставе такога ўзроўню ўдзельнічаў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны. Яго прадстаўляў начальнік сектара новых інфармацыйных тэхналогій інфармацыйна-вылічальнага цэнтра А.А.Федарцоў. Спектр прадстаўленых на беларускім стэндзе экспанатаў быў даволі шырокім: ад інфармацыйных сайтаў да вымяральных прыбораў.

Асноўным экспанатам ГДУ імя Ф.Скарыны на выставе стаў праект "Дыстанцыйнае навучанне ў Беларусі". У цяперашні час у гэтым праекце зарэгістравана звыш 3300 карыстальнікаў з 42 краін свету. Акрамя таго, "па-за конкурсам" дэманстраваліся сродкі сумеснай распрацоўкі апаратнага і праграмнага забеспячэння ўбудаваных сістэм. Набор сродкаў дазваляе ў кароткія тэрміны праектаваць розныя лічбавыя сістэмы, у тым ліку і шматпрацэсарныя.

Як зазначыў А.А.Федарцоў, аб выніках удзелу ГДУ ў СеВІТ гаварыць пакуль што заўчасна. Але ўжо з упэўненасцю можна сцвярджаць, што дэбют адбыўся. Аб распрацоўках універсітэта ў галіне інфармацыйных тэхналогій даведаліся прадстаўнікі многіх замежных фірм і арганізацый. Усяго было праведзена звыш 50 дзелавых перамоў.




# ШТО МЫ ДУМАЕМ АБ ГЕАГРАФІІ?

Сучасныя студэнты-географы праяўляюць вялікую цікавасць да школьнай геаграфіі. Нас цікавіць тое, што вучні сярэдніх школ думаюць аб геаграфіі? Нам хацелася даведацца аб тым, што нас чакае ў школе, калі мы станем настаўнікамі? Гэтыя пытанні захоплівалі нас доўгі час і таму членамі гуртка "Методыка выкладання геаграфіі" былі прапанаваны наступныя пытанні вучням 8-10 класаў:

1. Ці трэба вывучаць геаграфію ў школе? Калі так, то чаму?
2. Геаграфія – гэта галоўны, ці другарадны прадмет у школе?
3. Ці падабаюцца вам метады выкладання геаграфіі?
4. Што б вы хацелі змяніць у метадах выкладання?
5. Чаму вы аддаеце перавагу – фізічнай ці эканамічнай геаграфіі?
6. Пра што новае аб геаграфіі як навуцы вы хацелі б даведацца?

Да нашага вялікага здзіўлення мы ўбачылі наступныя адказы: вучні ў сваёй большасці (86%) лічаць вывучэнне геаграфіі неабходным, таму што навука мае шмат навукова-пазнаваўчага матэрыялу, хаця большасць адносіць геаграфію да другарадных прадметаў у школе (73%). Таксама здзівіў нас адказ на пытанне "Што б вы хацелі змяніць у метадах выкладання геаграфіі?". Школьнікі скардзяцца на недасканаласць падручнікаў (29,5%). Падручнікі, сцвярджаюць яны, цяжкія для іх успрыняцця. Вялікая колькасць кантрольных і самастойных работ прывялі да таго, што дзеці жадаюць іх змяншэння, таксама як і аб'ёмаў хатняга задання (9%). Нас зацікавілі адказы аб недахопах практычных заняткаў, адсутнасці экскурсій і нецікавых уроках. Нас вельмі насцярожыў адказ аб тым, што дзеці не жадаюць нічога мяняць (28%).

На пытанне аб тым, што новага вучні жадаюць даведацца аб геаграфіі як навуцы, мы атрымалі адказы пра недахоп інфармацыі аб жывёльным і раслінным свеце. Таксама вучні імкнуцца вывучаць палітычнае жыццё, геаграфію краін і кантынентаў.

Вынікі даследавання былі эмацыянальна абмеркаваны выкладчыкамі і студэнтамі на пасяджэннях гуртка і ў час навуковай канферэнцыі, арганізаванай кафедрай геаграфіі.

У будучым мы плануем правесці аналіз меркаванняў настаўнікаў і вучняў аб якасці падручнікаў і іншых праблемах выкладання геаграфіі.

**А.КРУКАЎ,**
**староста гуртка "Методыка выкладання геаграфіі",**
**А.РУСАКОВА,**
**член гуртка.**

# БУДУЧЫЯ ЮРЫСТЫ – У ПРЫЗЁРАХ

У Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі праведзена гарадская міжвузаўская алімпіяда сярод студэнтаў нямоўных факультэтаў па англійскай мове. Ад нашага універсітэта ўдзел у ёй прымалі чатыры студэнты другога курса юрыдычнага факультэта. Пасля трохтуравай барацьбы трэцімі прызёрамі гэтага своеасаблівага саперніцтва сталі Аляксей Каленік і Юлія Халмоўская. Чацвёртае месца дасталося Аляксею Нікалаенку.

# ИСТОРИЯ В ФОТООБЪЕКТИВЕ

Профессия историка предполагает освоение разнообразных видов деятельности, в том числе обладание знаниями и умениями в области музейного дела. Этой важнейшей составляющей подготовки специалиста-историка посвящена архивно-музейная практика. Летом 2001 года студенты 2 курса исторического факультета в ходе ее проведения под руководством доцента кафедры истории славян и специальных исторических дисциплин О.Г.Ященко слушали лекции по музейному делу, писали историческое сочинение по различным аспектам краеведения, посещали выставки, готовили и проводили учебные экскурсии по городу и т.д. Основная часть музейной практики проходила в Гомельском областном краеведческом музее, где неоценимую помощь в приобретении навыков работы наряду с другими сотрудниками музея оказала Алла Борисовна Егорова. Именно ее консультации помогли решить главную задачу практики: ознакомиться с научным описанием музейных предметов – основным видом научно-музейной документации. Мы, студенты-историки, должны были научиться квалифицированно осуществлять научно-исследовательскую работу, которая включала в себя, прежде всего, аннотирование научно-инвентарных карточек.

Историческим материалом для работы послужил уникальный и богатейший фотоархив Петра Ефимовича Белоуса, бывшего фотокорреспондента газеты "Гомельская праўда". Некоторые студенты в Гомельской областной универсальной библиотеке имени В.И.Ленина проводили работу по составлению карточек на фотографии П.Е.Белоуса, помещенные в газете "Гомельская праўда" во второй половине XX века.

Свой успешный и плодотворный творческий путь П.Е.Белоус начал в 1946 году – тяжелое для населения Гомеля время послевоенной разрухи и неустроенности. Нелегко приходилось молодому корреспонденту. Необходимо было преодолевать многие километры до отдаленных районов области для того, чтобы сделать нужные снимки. И, тем не менее, он смог запечатлеть различные моменты жизни Гомельщины и жителей. И теперь, благодаря этим снимкам, мы можем представить историю послевоенного Гомеля и гомельчан.

Огромное количество материалов относится к 60-80-м годам XX века: отсняты промышленные гиганты Гомельской области, поликлиники, учебные заведения и события культурной жизни города, запечатлены лица прославленных гомельчан. Превратности судьбы не смогли сломить П.Е.Белоуса, он продолжал работать, и на фотопленке появлялись все новые изображения – спортивные соревнования и визиты именитых гостей города, городские праздники и зарисовки природы в окрестностях Гомеля. Деятельность П.Е.Белоуса не осталась незамеченной. Он был дважды лауреатом Всесоюзных творческих конкурсов, лауреатом премии Союза журналистов БССР, заслуженным работником культуры БССР. Снимки, которые делал Петр Ефимович, помещены более чем в двух десятках книг.

Архив, созданный П.Е.Белоусом, – это фотолетопись истории Гомеля и области на протяжении второй половины XX века. Ценные документальные материалы в фондах Гомельского областного краеведческого музея ждут дальнейшей обработки и своих исследователей, в том числе и студентов-историков, интересующихся краеведческой проблематикой. И мы надеемся, что в период будущей летней музейной практики начатая работа продолжится, и представители исторического факультета внесут свой достойный вклад в воссоздание истории Гомельщины.

**П.ЖДАНОВИЧ,**
**Л.СУШКО,**
**студенты гр. И-32 исторического факультета.**

# ЗАПРАШАЕ ПОЛЬСКІ ІНСТЫТУТ

З кожным годам наш універсітэт пашырае і ўмацоўвае навуковыя і культурныя сувязі з навучальнымі ўстановамі Заходняй Еўропы. Робяцца адпаведныя крокі і з боку нашых суседзяў. Так, напрыклад, Польскі інстытут у Мінску, які з'яўляецца самастойнай структурнай адзінкай Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Польшча, на працягу больш за 6 гадоў прадстаўляе ў Беларусі польскую культуру, навуку і мастацтва. (Мінулай восенню, як многія памятаюць, гэтая ўстанова перадала нашаму універсітэту больш за 400 кніг з розных галін ведаў на польскай мове). У межах сваёй дзейнасці Польскі інстытут арганізаваў 2-х гадовыя курсы польскай мовы ў шэрагу абласных і раённых цэнтраў рэспублікі. Па дамоўленасці з рэктаратамі польскую мову вывучаюць 3 групы студэнтаў у БДПУ імя М.Танка ў Мінску, 2 групы студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў – у Віцебскім дзяржуніверсітэце імя П.М.Машэрава, а з лютага 2002 г. такія курсы адкрыліся ў Магілёўскім дзяржуніверсітэце імя А.Куляшова.

Нашай навучальнай установе таксама прапанавана праводзіць заняткі па польскай мове са студэнтамі 2-х – 4-х курсаў нефілалагічных спецыяльнасцей. Таму з наступнага навучальнага года для групы жадаючых (25-30 чалавек) мяркуецца выдзеліць аўдыторыю для такіх заняткаў, якія будзе праводзіць выкладчык нашага універсітэта. Польскі бок забяспечвае аматараў мовы неабходнай метадычнай літаратурай і аўдыё-візуальнымі дапаможнікамі. Курсы будуць працягвацца 2 гады з кастрычніка па май штогод, 2 разы ў тыдзень па 2 акад. гадзіны. Мэтай курсаў з'яўляецца не толькі навучанне польскай мове, але таксама знаёмства слухачоў з польскай культурай і садзейнічанне ва ўстанаўленні навуковых і культурных сувязей з Польшчай. Удзельнікі курсаў рэгулярна будуць атрымліваць інфармацыю пра культурныя мерапрыемствы, якія праводзіць інстытут, а таксама пра стыпендыяльныя праграмы, што арганізоўваюцца ў Польшчы для студэнтаў з Беларусі. У мінулым годзе, па звестках інстытута, 11 удзельнікаў курсаў праходзілі навуковыя стажыроўкі ў Польшчы. Курсы – бясплатныя.

Кантактны тэлефон – 55-78-64.

**Рыгор СЕРЫКАЎ,**
**дацэнт кафедры беларускай мовы.**

**Мистер университета – 2002**



Да, да, на самом деле, того, кто отважился ринуться в бой за получение престижного титула "Мистер университета", чтобы проявить свои лучшие качества в разного рода нелегких и неожиданных испытаниях на звание "самого, самого, самого...", можно назвать героем. Ведь переполненный зрительский зал, члены жюри ждут от конкурсанта эрудиции и смекалки, чувства юмора и фантазии, практических навыков и ловкости. И чтобы оправдать их надежды, надо иметь не только сильное желание победить, но и определенные для этого качества – мужество, отвагу и смелость.

# ДВЕНАДЦАТЫЙ ГЕРОЙ

В нынешнем традиционном конкурсе звание "Мистер университета 2002 г." оспаривалось уже в 12 раз! Ведущие напомнили имена и фамилии 11 предыдущих героев разных лет, многие из которых, несмотря на то, что студенческие годы уже остались позади, пришли в актовый зал ГГУ вспомнить свою "молодость" и поболеть за нынешних их "коллег".

Элемент новизны, внесенный организатором конкурса – студенческим клубом молодежного комплекса университета в сценарий этого конкурса, очень оживил зрительный зал, так как и он стал непосредственным участником происходящего. Проведенная игра-конкурс перед началом основных событий определила и альтернативного участника "Мистера...". Им стал студент 4 курса физического факультета Игорь Точило.

На творческие баталии, где "мужчины благородны и щедры, умеют любить женщин, знают толк в винах, лошадях, огнестрельном оружии и спорте" мужественно вышли 8 студентов – представителей 7 факультетов: Александр Аммон (физический факультет), Юрий Коновков (экономический факультет), Виталий Чеховский, Павел Свердлов (факультет физической культуры), Ярослав Бычковский (факультет иностранных языков), Иван Николайцев (матфак), Дмитрий Ткач (истфак), Андрей Никитинский (биофак). Представив себя в своеобразной визитной карточке, они "шагнули в неизвестность" к пяти конкурсам – литературному, хозяйственному, театральному, музыкальному, а также посвященному празднику женщин – 8 Марта. Они "ломали" головы, что принесет жителям Земли графическое начертание 2002 года с учетом переосмысления событий предыдущих времен, мистики, магии и реальности сегодняшнего и завтрашнего дней; как наиболее удачно поздравить с первым весенним праздников тещу, жену друга или бывшую одноклассницу; приготовить завтрак для того, кто в один из дней окажется с тобой в квартире; придумать и воссоздать рекламные позывные радио ГГУ им. Ф.Скорины и др.

Пока конкурсанты выполняли свои задания, зал развлекали своими выступлениями СТЭМ "13-ый факультет", лауреаты конкурса "А ну-ка, первокурсник – 2001 г.!" Юлия Нефедова и Ольга Кабаева, другие участники художественной самодеятельности студенческого клуба.

Суммировав баллы всего творческого единоборства, жюри определило лучших: обладателем почетного титула "Мистер университета 2002 года" стал Виталий Чеховский, "Вице-мистером" объявлен Ярослав Бычковский. Приз зрительских симпатий достался Юрию Коновкову, учредил свой приз и профком студентов, который был отдан Павлу Свердлову.

Победители и участники конкурса получили ценные подарки, призы, сувениры от организатора конкурса – студенческого клуба, спонсоров – профкома студентов и молодежного городского клуба "Адреналин", представляющего различные течения и направления танцевальной музыки.

**Т.ДУБЯК.**



**НА СНИМКЕ: "Мистер университета 2002 года" Виталий Чеховский. Фото В.Чистика.**

**ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА**

# РЭХА ДЗЯЦІНСТВА

Тое, што адбылося нядаўна са студэнтамі-філолагамі чацвёртага курса, можна ахарактарызаваць прыблізна так: "Дзяцінству ты не скажаш "да пабачэння", дзяцінства не развітваецца з табой". Не паспелі мы апамятацца ад зносін з дзеткамі ў школе ў час педпрактыкі, як раптам апынуліся ў свеце цудоўнай казкі. Гэта "свята дзяцінства" нам падарыў нам. дэкана факультэта Леанід Пятровіч Кузьміч, запрасіўшы на сустрэчу з намі сапраўднага казачніка А.З.Караленку.

Анатоль Захаравіч аказаўся неардынарнай асобай, вельмі вясёлым чалавекам, як і патрэбна прафесійнаму казачніку. Наш госць прайшоў цікавы жыццёвы шлях: працаваў на нафтавых свідравінах Каўказа, зараз – пенсіянер, пражывае ў г.Рэчыцы і ... творыць хлопчыкам і дзяўчынкам дзяцінства. Былая прафесія вызначыла тэматыку яго казак: піша ён пра нафту, газ і, увогуле, пра прыроду. Радуе тое, што аўтар прысвячае многія свае казкі дзецям-сіротам, некаторыя яго творы перакладзены на іншыя мовы свету.

А.З.Караленка падзяліўся з намі таямніцай сваёй творчасці: аказваецца, і ў казачнікаў бываюць нечаканыя творчыя азарэнні, і да іх з'яўляецца Муза, і яны бачаць свае будучыя творы ў снах. Ён прачытаў нам дзве свае апошнія казкі "Бабушка нефтяных скважин" и "Сосна". Яго казкі не толькі захапляльныя, але і маюць высокі пазнаваўчы патэнцыял! Невыпадкова яны ўключаны ў школьныя падручнікі па прыродазнаўству.

Мы даведаліся, што наш госць яшчэ і вершы складае, песні, іграе на баяне. Кульмінацыяй нашай сустрэчы сталі песні "на нафтавую" тэму і "Про котика", якія выканаў сам аўтар. Анатоль Захаравіч крышачку не ўлічыў узроставыя асаблівасці аўдыторыі, але нам вельмі спадабаўся яго музычны падарунак. Працяглымі апладысментамі і цёплымі словамі дзякавалі мы свайго госця.

"Пакуль будуць на Зямлі дзеці, будуць патрэбны казкі", – такое крэда Анатоля Захаравіча. А я б дадала: "Пакуль будуць на Зямлі такія добрыя казачнікі, будзе ў кожнага, нават дарослага чалавека, святлей на душы". Невыпадкова ж кажуць: дарослыя – гэта тыя ж дзеці, толькі цацкі ў іх іншыя.

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ, студэнтка гр. РБ-43 філфака.**



# ЗА МАЙСТЭРСТВА І ФАНТАЗІЮ

... Ад такой прыгажосці цяжка адарваць позірк. Хочацца спачатку налюбавацца ёй, зачаравацца фантазіяй, створанай жаночымі рукамі са звычайных на першы погляд прадуктаў, а потым ужо адчуць у роце і непаўторны смак. Тарты, пячэнне, пірожныя – такі асартыментны пералік смачных "экспанатаў" выстаўкі, праведзенай нядаўна Саветам жанчын, прафкамамі універсітэта. Іх удзельніцы, супрацоўніцы і студэнткі, матэрыяльна заахвочаны за кулінарнае майстэрства.

**На здымку: наведвальнікі выстаўкі знаёмяцца з яе экспанатамі.**

**Фота У.Чысціка.**

# ЧЭМПІЁН У СЁМЫ РАЗ



У раённым цэнтры г.Драгічыне, што на Брэстчыне, праведзены чарговы чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў. На памосце зноў выдатна выступіў майстар спорту СССР дацэнт кафедры філасофіі нашага універсітэта Аляксей Фяськоў. У сваіх узроставай групе і вагавай катэгорыі ён быў па-за канкурэнцыяй і ў сёмы раз заваяваў вышэйшую ўзнагароду чэмпіянату.

Цяпер Аляксей Андрэевіч актыўна рыхтуецца да чэмпіянату Еўропы ветэранаў-цяжкаатлетаў, які адбудзецца ў маі ў сталіцы Фінляндыі – г.Хельсінкі. Наш асілак разлічвае і тут узняцца на самую высокую прыступку п'едэстала гонару.

Пажадаем жа яму поспеху!

**СПОРТ**

# САПЕРНІЧАЛІ ГІРАВІКІ





Нядаўна ў нашым універсітэце ўпершыню былі праведзены спаборніцтвы па гіраваму спорту. Яны выклікалі вялікую цікавасць у гледачоў. І не выпадкова. Гэты від спорту набывае ўсё большую папулярнасць, а правядзенне спаборніцтваў асілкаў не патрабуе вялікіх затрат.

**На здымках: 1. Момант спаборніцтва. 2. Студэнт групы Ф-12 фізічнага факультэта Мікалай Хвацюк, які стаў пераможцам спаборніцтваў у адной з вагавых катэгорый.**

**Фота У.Чысціка.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

– псіхалогіі – асістэнта;
– крымінальнага права і працэсу – асістэнта;
– тэорыі і гісторыі дзяржавы і права – асістэнта;
– грамадзянска-прававых дысцыплін – асістэнта (2);
– тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка;
– нямецкай мовы – выкладчыка (2);
– фізвыхавання і спорту – старшага выкладчыка, выкладчыка (3);
– давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі – асістэнта (2);
– тэарэтычнай фізікі – асістэнта;
– Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў – асістэнта (2).

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

# НА АДПАЧЫНАК – З ПУЦЁЎКАЙ

У камісію па аздараўленню супрацоўнікаў Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны на II квартал 2002 г. паступілі наступныя пуцёўкі:

**Па ЧАЭС:**

санаторый **"Крыніца"** – (органы стрававання), з 14 мая па 3 чэрвеня – 2 пуцёўкі;

санаторый "**Прыдняпроўскі**" – (апорна-рухальная і нервовая сістэмы), з 29 чэрвеня па 19 ліпеня – 2 пуцёўкі;

санаторый-прафілакторый **"Гомсельмаш"** – з 3 чэрвеня па 23 чэрвеня – 2 пуцёўкі;

санаторый **"Залатыя пяскі"** (Гомель) з 24 чэрвеня па 14 ліпеня – 2 пуцёўкі;

санаторый **"Белая Русь"** (Туапсе) – з 2 мая па 25 мая – 1 пуцёўка.

**Па сацстраху:**

санаторый "**Нарач**" (органы стрававання), з 29 мая па 18 чэрвеня – 1 пуцёўка;

санаторый **"Сасновы бор"** (органы стрававання і нервовай сістэмы) з 27 красавіка па 17 мая – 1 пуцёўка.

Па пытаннях атрымання пуцёвак звяртацца ў камісію па аздараўленню супрацоўнікаў універсітэта. Тэл. 57-19-22.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 205.
Падпісана да друку 22.04.2002г.